УДК 371.3:808.26

Т.Ул. Жукоўская, выкладчык

# ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АСОБАСНА АРЫЕНТАВАНАЙ МАДЭЛІ ВЫХАВАННЯ І АДУКАЦЫІ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

In the article personal forming is shown through the influence of the national factors.

Складаныя і неадназначныя працэсы, якія адбываюцца сёння ў палітычным, эканамічным і духоўным жыцці Беларусі, адбіваюцца на стане і атмасферы навучальных устаноў, прымушаюць па-новаму паглядзець на арганізацыю вучэбна-выхаваўчага працэсу ў студэнцкім асяроддзі. У сучаснай парадыгме гуманізацыі адукацыі і асэнсавання чалавека як самакаштоўнасці востра стаіць праблема выхавання асобы, здольнай рэалізаваць свой патэнцыял, быць суб'ектам сваёй жыццядзейнасці. Гэта дыктуе больш глыбокае разуменне выхавання і адукацыі і прад'яўляе якасна іншыя патрабаванні да выкладання прадмета. Ажыццяўляемая сёння рэформа адукацыі актывізавала намаганні ўсіх выкладчыкаў беларускай мовы па забеспячэнні асобасна арыентаванай мадэлі выхавання і адукацыі. Гэта мадэль ставіць у цэнтр усяго вучэбна-выхаваўчага працэсу асобу студэнта.

Бясспрэчна, што інжынер, выдавец, эканаміст і г. д. павінны быць высокакваліфікаванымі спецыялістамі, майстрамі сваёй справы. Але яшчэ пры ўсіх сваіх прафесійных ведах яны павінны быць сапраўднымі асобамі – людзьмі высокай унутранай і знешняй культуры, носьбітамі глыбокай маральнасці, інтэлігентнасці, дабрыні. Багатыя магчымасці ў фарміраванні светапогляду будучага спецыяліста адкрывае вывучэнне роднай мовы.

З мэтай укаранення новых тэхналогій у вучэбна-выхаваўчы працэс выкарыстоўваюцца разнастайныя дзейсныя і эфектыўныя формы работы. Гэта і анкетаванне, і дыскусіі, і выступленні з рэфератыўнымі тэмамі, і пераказ, і сачыненні-разважанні, сачыненні-замалёўкі, сачыненні па пачатку, і водгукі, і нетрадыцыйныя формы заняткаў: музейныя заняткі, семінары, прэзентацыі студэнцкіх творчых работ, сустрэчы з вядомымі літаратарамі, выдаўцамі і іншыя формы работ, якія дазваляюць студэнтам самарэалізоўвацца, павышаць свой інтэлектуальны і духоўны ўзровень. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што галоўным і вызначальным атрыбутам і крытэрыем прафесіяналізму і духоўнага аблічча асобы з'яўляецца творчасць. Студэнту павінны быць прадстаўлены максімальныя магчымасці для фарміравання ў яго ўстаноўкі на творчую дзейнасць. У любой форме навучання, у кожным матэрыяле задача застаецца адной і той жа: раскаваць думку навучэнца, навучыць яго імкнуцца да стварэння новага, нестандартнага, рабіць самастойны выбар, прымаць самастойныя рашэнні за сябе і за іншых людзей, наогул, сфарміраваць у яго прынцыповую ўстаноўку на творчасць. Для сябе я вызначыла, што творчасць выкладчыка – гэта яго здольнасць выяўляць не ўласныя лепшыя якасці: эрудыцыю, веды, камунікабельнасць, пачуццё гумару, красамоўства, асацыятыўнасць мыслення, а стварыць сітуацыю, справакаваць студэнтаў на выяўленне, і што яшчэ важней – на развіццё лепшых якасцей і прыродных здольнасцей сваіх выхаванцаў.

Зразумела, што творчае мысленне вызначаецца індывідуальнай непаўторнасцю асобы, а яго выхаванне з'яўляецца сапраўды гуманістычным выхаваннем, таму што абапіраецца на індывідуальнасць і развівае яе. Уменню бачыць і сцвярджаць магчымасці кожнага студэнта, ствараць для яго сітуацыю поспеху дапамагаюць разнастайныя па форме, змесце, напаўняльнасці заняткі па роднай мове.

Дэбаты і дыскусіі на самыя розныя тэмы і па самых розных праблемах (традыцыі і гісторыя; духоўнае і матэрыяльнае; свядомасць і манкурцтва; бацькі і дзеці і т. д.), прэзентацыя напрацовак у групах і індывідуальных заданняў студэнтаў, лінгвістычныя турніры, карацей, усё, што правакавала студэнтаў на выяўленне лепшых інтэлектуальных і маральных якасцей і адначасова вымагала ад іх неабходнасці выражэння гэтага лепшага менавіта на роднай мове.

У сваіх пісьмовых і вусных водгуках, разважаннях на прапанаваныя тэксты вядомых аўтараў студэнты не толькі ўдасканальваюць сваё маўленчыя навыкі, спасцігаюць пэўныя веды, але і пераконваюцца яшчэ раз у багацці і прыгажосці роднага слова, у магчымасці глыбокай і шырокай перадачы сваіх думак пасродкам гэтага багацця. Абавязковай умовай эфектыўнага інтэлектуальнага, маральнага развіцця студэнтаў з'яўляюцца праблемныя пытанні паводле матэрыялаў выступленняў з рэфератамі, іх аналіз, рэцэнзаванне, выкананне і абарона творчых прац.

Даволі эфектыўным, цікавым падаецца мне прэзентацыя сінхроннага перакладу тэкстаў, конкурс на лепшы сінхронны пераклад, конкурс на лепшае асацыятыўнае студэнцкае пытанне паводле тэксту-перакладу. Менавіта такое асацыятыўнае пытанне спрыяе засваенню тэксту, азнаямленню з рознымі поглядамі і падыходамі знакамітых аўтараў краязнаўчых і спецыяльных тэкстаў на тыя ці іншыя праблемы.

Практыкаванні, якія прапануюцца на занятках, скампанаваны так, каб праца з імі не была механічнай, і таму марнай для студэнтаў і шкоднай для самой мовы. Моўны і маўленчы дыдактычны матэрыял здольны забяспечыць рэалізацыю самастойнасці студэнта як умову для паспяховага моўнага і інтэлектуальнага развіцця. Перавага надаецца практыкаванням у выглядзе інфармацыйна насычаных тэкстаў, якія маюць таксама вялікі эстэтычны і выхаваўчы патэнцыял. Трэба адзначыць, што заданні разлічаны не толькі на фарміраванне моўных навыкаў, але і на арганізацыю інтэрактыўнага навучання, якое аказвае пазітыўны ўплыў на вызначэнне вядучай ролі кожнага студэнта пры працы ў парах і групах.

Відавочны рост асобаснай актыўнасці, творчых падыходаў, імкненне да адукацыі, самарэалізацыі, дыялогу з іншымі людзьмі і грамадствам у адной часткі маладых людзей і абыякавасці, замкнутасці другой падводзіць да пытання: чаму так адбываецца? Больш пільнай увагі ў сувязі з гэтым заслугоўваюць перакананні і погляды, дзеянні і ўчынкі, матывы і праяўленні пачуццяў навучэнцаў. Каб выявіць стаўленне да паняццяў, праяў, дзеянняў, якія можна вызначыць як асобасныя, была прапанавана ў адной з груп анкета «Я – асоба», куды ўвайшлі наступныя пытанні:

1. Што, на Вашу думку, азначае паняцце «асоба»?
2. Як універсітэт, выкладчыкі дапамагаюць Вам станавіцца асобай?
3. Якую ролю Вы самі адыгрываеце ў развіцці ўласнай асобы?
4. Ад чаго залежыць развіццё асобы?
5. Чаму ў некаторых пачынаецца працэс дэградацыі асобы?
6. Што ў большай ступені з'яўляецца паказчыкам развіцця асобы: тое, што бярэ асоба ад іншых і жыцця, ці тое, што аддае іншым, грамадству?

Пры аналізе адказаў трэба адзначыць, што большасць студэнтаў дакладна вызначылі паняцце «асоба», падкрэслілі ролю універсітэта, выкладчыка, калектыву (групы) у развіцці сваёй асобы, указалі на выхаваўчае ўздзеянне праз навучанне. Выяўляючы фактары, якія абумоўліваюць развіццё асобы, студэнты вылучаюць тыя, якія можна назваць як знешнія: залежнасць ад навакольнага свету, грамадства, калектыву, сяброў, бацькоў, становішча ў краіне і г. д. Такім чынам, менш за ўсё – ад самога сябе. Нельга

сцвярджаць, што маладыя людзі адводзяць сабе дастаткова пасіўную, сціплую ролю ў развіцці ўласнай асобы, але падставы для разваг, безумоўна, ёсць. І гэта дазволіць не толькі выявіць прабелы ў пошуках новых педагагічных формаў, арыентаваных на развіццё вучэбна-выхаваўчага працэсу, на асэнсаванне, аналіз, карэкцыю ўсёй бягучай дзейнасці з улікам індывідуальных патрэбнасцей, праблем і супярэчнасцей, магчымасцей і схільнасцей кожнага члена студэнцкага калектыву.

Ролю і месца беларускай мовы ў фарміраванні спецыяліста-грамадзяніна цяжка пераацаніць. Моўнае развіццё чалавека непарыўна звязана з развіццём мыслення, фарміраваннем яго духоўнага аблічча. Асобасна арыентаваныя тэхналогіі вучэбна-выхаваўчага працэсу на занятках па беларускай мове накіраваны на стварэнне ўмоў для развіцця і самаразвіцця навучэнца, садзейнічаюць уваходжанню яго ў кантэкст сучаснай культуры, станаўленню яго як суб'екта і стратэга ўласнага жыцця, дастойнага Чалавека.

## ЛІТАРАТУРА

1. Педагогическая энциклопедия. – М.: Сов. Энциклопедия, 1965.
2. Гражданское образование: зарубежный опыт, проблемы развития / Под ред. А.А. Михайлова и др. – Мн., 1999.
3. Киркос Д.И. Индивидуальность и творческое мышление. – М., 1992.
4. Крываносава А. Асноўныя сродкі і метады маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў // Веснік БДУ. – 1999. – № 3.
5. Наумчик В.Н. Воспитание творческой личности: Учеб.-метод. пособие. – Мн.: Універсітэцкае, 1998.

УДК 882. 26 : 371.3 (1–15)

Т.М. Федарцова, ст. выкладчык

# МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ ТЭМЫ «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ КУЛЬТУРЫ»

In the article the theme of studying Belorusian literature abroad is considered.

Адно з асноўных палажэнняў канцэпцыі літаратурнай адукацыі – арыентацыя на нацыянальныя і агульначалавечыя духоўныя каштоўнасці. Прыярытэт агульначалавечых ісцін мае на ўвазе пазбаўленне ад дагматызму ў вывучэнні літаратуры, таму новыя падыходы скіраваны не толькі на абнаўленні зместу, але і на практыку аналізу мастацкіх твораў у кантэксце аналагічных з'яў у сусветнай культуры мастацкага слова.

Сучасная канцэпцыя літаратурнай адукацыі прадугледжвае параўнальны аналіз з аналагічнымі працэсамі і з'явамі ў сусветнай літаратуры. Напрыклад, аналіз рамана А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» падаецца ў параўнанні з раманам чэшскага пісьменніка Я. Гашака «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка ў час сусветнай вайны», п'есай французскага драматурга, аднаго з заснавальнікаў мадэрнісцкага «тэатра абсурду» Эжэна Іанескі «Насарог» і п'есай Самуэла Бекета «У чаканні Гадо», а драматургія Францішка Аляхновіча (яго «новая драма») разглядаецца ў кантэксце творчасці такіх знакамітых майстроў драматургічнага жанру, як Генрык Ібсэн, Марыс Метэрлінк, Бернард Шоу, Герхарт Гаўптман, Юхан Аўгуст Стындберг і іншыя.

Галоўная асаблівасць новага падыходу да методыкі выкладання літаратуры заключаецца ў тым, што аналіз мастацкага твора становіцца актам пошуку ісціны. Сту-